


# Краязнаўства на беларускіх землях у перыяд Расійскай імперыі (1772/1795 — 1917 гг.)

## *Развіццё краязнаўчага руху ў 1772/1795 — 1864 гг.*

У канцы XVIII ст. адбыліся палітычныя падзеі, якія карэнным чынам змянілі гістарычнае развіццё Беларусі. Уключэнне ў склад Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў суправаджалася неаднаразовым змяненнем адміністрацыйна-тэрытарыяльных межаў беларускіх зямель. Між іншым, у 1796 г. Полацкае і Магілёўскае намесніцтвы былі аб'яднаныя ў Беларускую губерню, і гэтая назва ўпершыню ўвайшла ў афіцыйны зварот. На пачатку XIX ст. пытанні адміністрацыйнага ўпраўлення былі ўрэгуляваныя, і ў 1802–1917 гг. большасць этнічнай тэрыторыі беларусаў увахо-дзіла ў склад 5 губерняў: Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай.

Пэўны лібералізм палітыкі Паўла I і Аляксандра I «на землях от Польши отошедших» пасеяў сярод часткі шляхты ілюзію, што магчыма захаваць у «значнай частцы тое, што нам Айчына давала... хаця і без Польшчы – мы ў Польшчы» – такія настроі адлюстраваныя ў запісках сучасніка. Але ў сацыякультурных умовах Расіі непазбежна павінны былі трансфармавацца сацыяльна-культурныя, канфесійныя і іншыя асаблівасці яе новых падданых. Дзяржаўны курс быў накіраваны на сціранне ў ліцвінаў-беларусаў гістарычнай нацыянальнай свядомасці, выхаванне маладых пакаленняў у духу афіцыйнай імперскай ідэалогіі, паслядоўную русіфікацыю. Разам з тым мясцовай адміністрацыі неабходна была інфармацыя аб рэгіёнах, веданне іх палітычных, эканамічных, культурных, гістарычных умоваў.

Гістарычная і сямейная (радавая) памяць пабуджала ліцвінаў-беларусаў не толькі са зброяй змагацца за адраджэнне ВКЛ, але вывучаць мінулае роднага краю, зберагаць крупінкі звестак аб падзеях мінулага. Гэтая памяць яшчэ моцна праяўлялася ў светапоглядзе людзей сталага ўзросту і моладзі, вылівалася ў так званы літоўскі ці польскі патрыятызм, жаданне ведаць мінулае свайго краю і сям'і, захаваць адметнасці ў мове (беларускай, польскай), паводзінах, традыцыях. Многія маладыя людзі спрабавалі сябе ў літаратурнай і мастацкай творчасці, дзе панавала эстэтыка рамантызму. Знакавыя для рамантызму праблемы разнароднасці культураў, звычаяў, моваў зліліся з грамадзянскімі патрыятычнымі настроямі і выклікалі незвычайны інтарэс да рэгіянальных даследаванняў. Упершыню загучалі заклікі вывучаць народную спадчыну і з'явіліся шматлікія даследчыкі фальклору, этнаграфіі, гісторыі. Іх ідэі выказаў знакаміты краязнавец Зарыян Даленга-Хадакоўскі (Адам Чарноцкі): «Трэба пайсці і схіліцца пад страху селяніна ў розных аддаленых старонках, трэба спяшацца на яго святы, забавы і розныя прыгоды. Там, у дыме, які ўздымаецца над галовамі, снуюць яшчэ старыя абрады, спяваюцца даўнія спевы і ў плясках прасталюдзінаў называюцца імёны забытых багоў».

Выбух лістападаўскага паўстання 1830–1831 гг. і яго падаўленне найгоршым чынам адбіліся на грамадска-палітычнай і культурнай сітуацыі на Беларусі. Урадавая палітыка ў дачыненні да Беларусі рэзка змянілася – пачалася мэтанакіраваная русіфікацыя – знішчэнне ўсяго, што магло нагадаць пра Беларусь і Літву як асаблівыя нацыянальныя раёны і як суб'екты знішчанай з еўрапейскай карты дзяржавы. Прадбачлівыя расійскія чыноўнікі і вучоныя разумелі, што адных рэпрэсіяў недастаткова: неабходна запусціць палітычны і ідэалагічны курс, які б уключаў вынішчэнне так званага імі «польского метежного духа» праз супрацьпастаўленне праваслаўя і каталіцызму, праз фармаванне ў беларусаў непрыхільнага стаўлення да ўсяго польскага і каталіцкага, укараненне ў свядомасць, што беларусы спрадвечна рускі і праваслаўны народ.

Гэтая палітыка мэтанакіравана і паслядоўна праводзілася ў сістэме адміністрацыйнага кіравання, адукацыі, дзейнасці бібліятэк і інш. У канцы 1831 г. Мікалай I закрыў Віленскі ўніверсітэт, выкладчыкі ўладкаваліся хто дзе як здолеў. Ігнат Бараноўскі з гэтай нагоды пісаў: «Пасля 1840 г. стала прыбываць [у край] усё больш моладзь з атрыманай адукацыяй ва ўніверсітэтах расійскіх. Лічба тая расла з года ў год, але да 1850 г. 3/4 гэтай моладзі з універсітэцкай адукацыяй забірала канспірацыя, адзіным вынікам якой была высылка на Каўказ, высылка на Сібір». Аднак і ў гэтых неспрыяльных умовах краязнаўчыя даследаванні беларускіх зямель не толькі не прыпыняліся, больш за тое – пашыраліся.

***Валянціна САІТАВА***

***(Працяг будзе)***

*Працяг тэмы. Пачатак у №№ 21–23, 34–36, 42 за 2012 год*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ